ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 26 (1138) ● 9 верасня 1976 г. ● Цана 2 кап. ● Газета выходзіць з 1935 г.

## СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

● АБ ПРАВЯДЗЕННІ ПАЛІТІНФАРМАЦЫЙ НА ГЕАФАКУ ● НАВІНЫ ПА БДУ ● ПІСЬМО З БУХАРЫ ● СТАРОНКА САВЕЦКА - БАЛГАРСКАЙ ДРУЖБЫ ● АБ ВЫНІКАХ КАМСАМОЛЬСКАЙ РАБОТЫ У МІНУЛЫМ ГОДЗЕ ● ІНТЭРВ'Ю З ПЕРШАКУРСНІКАМІ ● СТУДЭНЦКАЯ РЭЦЭНЗІЯ ● УВАГА: «КАФЕДРА» ГУМАРУ

НАВІНЫ

## У ДОБРЫ ШЛЯХ...

Вось прайшоў тыдзень, як яны, першакурснікі хімфака, пачалі вучыцца ва універсітэце. Новыя прадметы, новыя сябры, выкладчыкі—студэнцкае жыццё захапіла. А сёння будучыя хімікі сабраліся ля Памятнага знака, дзе ім будуць уручаны іх першыя студэнцкія дакументы — заліковыя кніжкі і студэнцкія білеты.

— Мы спадзяёмся, што ў вашых залікоўках, — гаворыць дэкан хімфака Г. А. Браніцкі, — будуць толькі добрыя і выдатныя адзнакі.

Першакурснікаў віншуе сакратар камсамольскай арганізацыі факультэта А. Скарапанаў. Урачыста гучаць словы клятвы студэнтаў, якія прысягаюць у веры факультэту, абяцаюць не ўраніць яго гонар. І вось у іх ужо свае асабістыя заліковыя кніжкі, білеты. У добры шлях, дарагія першакурснікі!

## У КАМІТЭЦЕ КАМСАМОЛА

7 верасня у БДУ адбылося пасяджэнне бюро камітэта камсамола, на якім былі падведзены папярэднія вынікі дзейнасці студэнцкіх будаўнічых атрадаў, намечаны план работы на новы навучальны год. Канчатковыя вынікі трэцяга працоўнага семестра будуць падведзены на расшыраным активе камсамольскай арганізацыі, які адбудзецца ў кастрычніку.

***

8 верасня ў БДУ засядала камісія па падвядзенню вынікаў сацыялістычнага спаборніцтва, прысвечанага XXV з'езду КПСС, якое праходзіць пад дэвізам «Ніводнага адстаючага побач!» паміж камсамольскімі арганізацыямі акадэмічных груп.

Вынікі агляду-конкурсу будуць надрукаваны ў наступных нумарах газеты.

## АРЫЕНЦІР—МАТЭРЫЯЛЫ XXV З'ЕЗДА КПСС

# ВУЧЫЦЬ ПРАПАГАНДЫСЦКАМУ МАЙСТЭРСТВУ

### З ПРАКТЫКІ ПРАВЯДЗЕННЯ ПАЛІТЫЧНЫХ ІНФАРМАЦЫЙ [illegible] НА ГЕАГРАФІЧНЫМ ФАКУЛЬТЭЦЕ

Арганізацыя і правядзенне палітычных інфармацый вядзецца па чатырох галоўных напрамках: аб палітычным жыцці краіны, аб міжнародным палажэнні, аб эканоміцы краіны і аб камуністычным выхаванні працоўных.

Тэматыка нашых палітінфармацый распрацоўваецца зыходзячы з гэтых чатырох напрамкаў з улікам рэкамендацый аддзела прапаганды і агітацыі ЦК КПБ (рэгулярна публікуецца ў рэспубліканскіх газетах), журнала ЦК КПСС «Агитатор» і парткома БДУ. Пры распрацоўцы сваёй тэматыкі мы ў той жа час улічвалі асаблівасці факультэта, курсаў.

Тэматыка палітінфармацый распрацоўваецца ўсякі раз на семестр, аднак па меры неабходнасці ў яе ўносяцца некаторыя карэктывы, дапаўненні. Пасля зацвярджэння тэматыкі на партбюро яна вывешваецца на дошцы для ўсеагульнага агляду, перадаецца камсамольскаму бюро факультэта і старшым куратарам на кафедры.

Прадметам палітычнай інфармацыі могуць быць самыя розныя падзеі. Але мы выходзім з таго, каб гэтыя факты пры асвятленні мелі палітычную завостранасць. У такім плане праводзіць палітычныя інфармацыі, на жаль, не заўсёды і не ўсім удаецца. Бывае і так, што яны зводзяцца да разбору фактаў ці звычайнай чыткі газетнага артыкула без належных палітычных вывадаў і каментарыяў. І ў гэтым, перш за ўсё, вінаваты мы — старэйшыя таварышы, выкладчыкі. Трэба вучыць нашых студэнтаў прапагандысцкаму майстэрству, вучыць правільна разумець значэнне палітычнай інфармацыі ў жыцці і ўмела даносіць гэтае разуменне да слухачоў.

У гэтай справе, як нам уяўляецца, вялікая роля належыць куратарам. Менавіта яны непасрэдна даходзяць да кожнага студэнта ў групе, даюць яму канкрэтныя парады і рэкамендацыі. Таму на семінарах куратараў, якія на нашым факультэце праходзяць практычна кожны вучэбны месяц, заўсёды ідзе размова аб практыцы правядзення палітычных інфармацый у групах і на курсах, абмяркоўваецца іх тэматыка.

Вялікія абавязкі ў арганізацыі і правядзенні палітінфармацый кладуцца на камсамольскія бюро ў групах і на курсах. Між іншым, гэта іх найперш абавязак. З гэтай мэтай партбюро сумесна з камсамольскім бюро факультэта ў мінулым навучальным годзе кожны семестр праводзілі вучобу аксканаў па ідэалагічнай і палітыка-выхаваўчай рабоце ў камсамольскіх бюро на курсах і ў групах, дзе асаблівая ўвага ўдзялялася падрыхтоўцы і правядзенню палітінфармацый у групах.

У мінулым навучальным годзе мы практыкавалі і такі метад: давалі больш падрабязныя распрацоўкі па асобных тэмах, напрыклад, аб матэрыялах XXV з'езда КПСС, XXVIII з'езда КПБ, аб Міжнародным годзе жанчын, аб Нарадзе ў Хельсінкі, рэкамендавалі літаратуру, рабілі падборку асобных артыкулаў і брашур.

Палітычная інфармацыя з'яўляецца школай падрыхтоўкі кадраў палітінфарматараў, агітатараў і нават лектараў. Таму мы імкнёмся да таго, каб прапагандысцкаму майстэрству вучыліся ўсе студэнты. Абсалютная большасць палітінфармацый у групах праводзіцца сіламі студэнтаў, але абавязкова пры ўдзеле куратараў. Куратары прысутнічаюць на палітінфармацыях не толькі для падтрымання парадку, яны падводзяць вынікі ці самі выступаюць з паведамленнямі.

Як правіла, палітінфармацыі ў групах і на курсах нашага факультэта праходзяць у пэўныя дні і часы. Напрыклад, на I і II курсах яны праводзяцца ў панядзелак, на III і IV— у чацвер. Гэта дысцыплінуе студэнтаў. Студэнты I групы I курса і цяпер з цеплынёй успамінаюць, якімі цікавымі былі паведамленні студэнтаў Н. Пажарскай і А. Чыжа на тэму «Ідзе вайна народная» (аб падзеях у Анголе), А. Вайтовіча — «Барацьба партугальскага народа за свабоду і дэмакратыю», А. Грабенькавай — «СССР—факты, падзеі, людзі», А. Хоміча і А. Васілеўскага — «Два міры—дзве ідэалогіі». Многія студэнты выступілі з паведамленнямі аб XXV з'ездзе КПСС і XXVIII з'ездзе КПБ. Зрываў палітінфармацый у групе не наглядалася, і ў гэтым немалая заслуга С. Артамонава, адказнага за правядзенне палітыка-масавай работы ў групе. Вялікую дапамогу ў арганізацыі і правядзенні палітінфармацый аказвалі куратар Р. Гілевіч і камсамольскі куратар, інжынер лабараторыі возеразнаўства Г. Гігевіч.

На II курсе ў I групе эканоміка-географаў, дзе куратарам дацэнт В. Бараздіна, цікава прайшлі палітінфармацыі па тэмах, якія цікавяць будучых эканамістаў, напрыклад: «Сацыялістычная інтэграцыя ў дзеянні» (палітінфарматар Т. Абрамовіч) і «Атамныя электрастанцыі СССР» (палітінфарматар Л. Шэсцель).

Асобна хочацца спыніцца на курсавых палітінфармацыях, якія на нашым факультэце карыстаюцца вялікай папулярнасцю. Гэта можа быць даклад, лекцыя або проста цікавая сустрэча. За апошнія гады перад студэнтамі выступалі І. В. Луцкевіч—адзін з першых камсамольцаў Беларусі, адважны разведчык часоў Вялікай Айчыннай вайны В. С. Клягін — юрыст («Аб рэвалюцыйнай пільнасці», «Аб ідэалагічнай дыверсіі замежных разведак супраць Савецкага Саюза»), Н. Ф. Федзюкова — загадчык кафедры інстытута культуры («Аб прыгажосці чалавечай» і «Аб эстэтычным выхаванні маладога чалавека»), С. Л. Петэрсон («Аб цудоўным у жывапісе»), І. І. Антановіч, лектар ЦК КПБ («ЗША — ідэалогія, палітыка, спосаб жыцця»). Надоўга застануцца ў памяці студэнтаў сустрэчы з касманаўтам Пятром Клімуком, з галоўным рэдактарам журнала «Работніца і сялянка» М. І. Карпенка і з галоўным рэдактарам журнала «Народная асвета» В. П. Маскаленка.

Перад студэнтамі рэгулярна выступаюць супрацоўнікі факультэта: О. Якушка, В. Навіцкі, Л. Паўловіч, В. Сінякова, М. Лаўрыновіч, Г. Рылюк, А. Шкляр, Н. Раманоўскі і іншыя. Яны расказваюць іх аб сваіх паездках у замежныя краіны.

Як і любая справа, правядзенне палітычных інфармацый таксама патрабуе кантролю. І ён праводзіцца на факультэце партбюро, камсамольскім бюро факультэта, дэканатам. Пытанні, звязаныя з правядзеннем палітінфармацый, выносяцца на абмеркаванне партбюро, савета факультэта, на семінары куратараў. Наладжваюцца рэйды-праверкі сіламі членаў партыйнага і камсамольскага бюро факультэта. Многа ўвагі гэтаму пытанню ўдзяляюць намеснік дэкана Р. Жмойдзяк, старшыя куратары Р. Гілевіч, В. Аношка, Л. Паўловіч, М. Лаўрыновіч.

Пералічаныя мерапрыемствы — далёка не адзіныя ў выхаванні нашых студэнтаў. Працэс фарміравання камуністычнага светапогляду чалавека патрабуе вялікага ўмення, упартай і карпатлівай штодзённай працы. У гэтым, нам здаецца, не апошняе месца павінна быць адведзена і палітычнай інфармацыі.

У нашай рабоце ёсць і пэўныя недапрацоўкі. Таму хочацца, каб на старонках газеты таварышы з другіх факультэтаў выказалі свае меркаванні аб месцы палітычнай інфармацыі ў выхаванні і жыцці студэнтаў, падзяліліся сваім вопытам.

**В. БАРУШКА,**
**старшы выкладчык кафедры агульнага землязнаўства геафака.**

## ПІСЬМО З ПАДЗЯКАЙ

Бухарскі абком Кампартыі Узбекістана выказвае гарачую падзяку рэктарату, партыйнай, прафсаюзнай і камсамольскай арганізацыям, усяму калектыву Белдзяржуніверсітэта за брацкую дапамогу ў ліквідацыі вынікаў землятрасення ў Бухарскай вобласці.

Самаадданa працуючы на будаўніцтве пасёлка газавікоў, байцы вашага студэнцкага будаўнічага атрада «Маладосць» (камандзір І. Піскароў, камісар Б. Чычыра) праявілі лепшыя якасці савецкай моладзі— высокую палітычную сталасць, працавітасць, патрыятызм і інтэрнацыяналізм, унеслі свой уклад у аднаўленне Газлі.

Жадаем выкладчыкам і студэнтам, усяму калектыву моцнага здароўя, поспехаў у вучобе, навукова-даследчай дзейнасці, у ідэйна-выхаваўчай рабоце па падрыхтоўцы высокакваліфікаваных кадраў, у выкананні гістарычных рашэнняў XXV з'езда КПСС.

**К. МУРТАЗАЕЎ,**
**сакратар Бухарскага абкома партыі.**

## НА СТАРЦЕ І НА ФІНІШЫ







**НА ЗДЫМКАХ:** студэнтка I курса вячэрняга аддзялення мехмата Н. Дашчынская толькі што атрымала заліковую кніжку; дэкан мехмата М. С. Гарашчук уручае дыпломы.
Фота М. НЕЧЫПАРЭНКІ.

# НАШЫ ВЫНІКІ, НАШЫ ЗАДАЧЫ

## НІВОДНАГА АДСТАЮЧАГА ПОБАЧ!

ВОСЬ УЖО паўгода пад такім дэвізам жыве, вучыцца і працуе камсамольская арганізацыя універсітэта. У гэтыя дні мы, як і ўсе камсамольскія арганізацыі ВНУ, аналізуем вынікі мінулага навучальнага года, трэцяга працоўнага семестра, вызначаем асноўныя напрамкі работы на новы 1976-77 навучальны год.

Мінулы год быў прыкметны дзвюма важнымі асаблівасцямі. Па-першае (і гэта галоўнае), камсамольская арганізацыя прыняла актыўны ўдзел ва ўсенародным спаборніцтве за дастойную сустрэчу XXV з'езда КПСС. 418 лепшых камсамольцаў падпісалі Рапарт універсітэцкай камсамоліі партыйнаму форуму. Па-другое, гэты год быў годам абмену камсамольскіх дакументаў. Больш 9 тысяч камсамольцаў атрымалі камсамольскія білеты узору 1975 года.

Умела арганізавалі спаборніцтва камітэты камсамола фізічнага (сакратар М. Абрамчук), філалагічнага (сакратар М. Ціцянкоў), хімічнага (сакратар А. Скарапанаў), механіка - матэматычнага (сакратар В. Прокашава) факультэтаў, камсамольская арганізацыя НДІ ПФП (сакратар Ю. Навікаў).

Вялікую ўвагу ўдзялялі і ўдзяляюць камсамольскія арганізацыі пытанням паспяховасці студэнтаў. На ўсіх факультэтах працавалі вучэбна-выхаваўчыя камісіі. Добрым прыкладам для іншых стаў грамадскі дэканат, арганізаваны на філфаку. Па выніках летняй экзаменацыйнай сесіі працэнт паспяховасці склаў 93,6. У нас 1192 студэнты - выдатнікі, амаль 4 тысячы займаюцца на «добра» і «выдатна». Знамянальна, што працэнт паспяховасці камсамольскага актыву роўны 100.

Студэнты універсітэта прымаюць актыўны ўдзел у навукова - даследчай працы (676 чалавек). Абсалютная большасць нашых студэнтаў удзельнічала ў першым туры VI Усесаюзнага конкурсу пэ грамадскіх навуках, гісторыі ВЛКСМ і міжнароднага маладзёжнага руху. 45 навуковых работ са 164, прадстаўленых на рэспубліканскі тур, атрымалі вышэйшую адзнаку.

Вялікую работу правялі камсамольскія арганізацыі па падрыхтоўцы да трэцяга працоўнага семестра 1976 года. Ва універсітэце было сфарміравана 66 лінейных атрадаў, у саставе якіх паспяхова працавалі 2077 байцоў.

На наш погляд, у мінулым навучальным годзе актывізавалася дзейнасць савета маладых вучоных універсітэта, шэфская работа камсамольскай арганізацыі, палепшыліся сувязі з творчымі калектывамі горада, паявіліся новыя формы вучобы камсамольскага актыву, работы ў студэнцкіх інтэрнатах.

Рытмічна працавалі на працягу вучэбнага года камітэты камсамола універсітэта, факультэтаў: былі праведзены 2 актывы, 3 пленумы, 25 пасяджэнняў бюро, у тым ліку сумеснае пасяджэнне з кафедрай гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў. Вялікую дапамогу ў рабоце камсамольскай арганізацыі аказваў актыў камітэта, які штодзённа аддаваў шмат часу цікавай, патрэбнай і разам з тым цяжкай працы ў камсамоле.

Вызначаючы задачы на будучае, неабходна адразу падкрэсліць, што на ўсіх асноўных напрамках працы ў нас ёсць значныя рэзервы, якія мы павінны выкарыстаць. Галоўная наша задача — павышэнне якасці вучобы. Цяперашняя пяцігодка і для студэнцтва павінна стаць пяцігодкай якасці. У нашых арганізацыях разгарнулася сацыялістычнае спаборніцтва пад дэвізам «Ніводнага адстаючага побач!» На жаль, мы не можам сказаць, што дабіліся ў гэтым напрамку вялікіх поспехаў. Так, працэнт паспяховасці па выніках летняй сесіі павялічыўся ў параўнанні з зімовай, але паменшыўся ў параўнанні з летняй сесіяй мінулага года. Большасць камсамольскіх арганізацый несур'ёзна, фармальна падышлі да арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва за павышэнне якасці вучобы. У правядзенні спаборніцтва не была забяспечана дастатковая галоснасць, параўнальнасць вынікаў, адсутнічала добра распрацаваная сістэма заахвочвання пераможцаў.

Бюро камітэта камсамола лічыць, што факультэцкія камітэты камсамола павінны ўзмацніць сваю ролю і ў арганізацыі студэнцкіх навуковых даследаванняў, у прыватнасці больш шырока ўцягваць студэнтаў у рашэнне канкрэтных задач.

Адзначаючы ў цэлым здавальняючыя вынікі трэцяга працоўнага семестра, неабходна падкрэсліць, што мы дапусцілі сур'ёзныя пралікі ў падрыхтоўцы байцоў да вядзення масава-палітычнай работы (гэта датычыць перш за ўсё матэматычных факультэтаў). Неабходна рэзка ўзмацніць ролю камітэтаў камсамола факультэтаў у падрыхтоўцы СБА, а таксама атрадаў, якія выязджаюць на ўборку ураджаю. Пэўна, мэтазгодней перадыслакаваць СБА БДУ з Крупскай зоны ў нашы падшэфныя раёны — Дзяржынскі, Стаўбцоўскі, Нясвіжскі, Клецкі.

Камсамольскія арганізацыі факультэтаў павінны многае зрабіць для павышэння эфектыўнасці вучобы камсамольскага актыву, узроўню ўнутрысаюзнай работы, шырока прыцягнуць да жыцця арганізацый двухтысячны атрад першакурснікаў.

У гэтыя дні ў камсамольскіх арганізацыях разгортваецца сацыялістычнае спаборніцтва за права падпісаць Рапарт Ленінскага камсамола ЦК КПСС да 60-годдзя Вялікага Кастрычніка. Узяўшы на ўзбраенне накоплены вопыт, мы павінны арганізаваць гэта спаборніцтва на высокім узроўні, якасна і эфектыўна.

Такія, з пункту гледжання бюро камітэта камсамола універсітэта, асноўныя напрамкі нашай работы ў бягучым навучальным годзе. Наша 11-тысячная арганізацыя мае цікавую гісторыю, багатыя традыцыі, вялікі вопыт. Усё гэта дае падставы быць упэўненым у тым, што мы паспяхова справімся з ускладненымі задачамі.

**А. ТОЗІК,**
**сакратар камітэта камсамола БДУ.**

## ПОСПЕХ ЗАЛЕЖЫЦЬ АД КОЖНАГА

Атрад «Юнацтва» — адзін з трох атрадаў падрыхтоўчага аддзялення БДУ імя У. І. Леніна — удзельнічаў у будаўніцтве комплексу сельскай гаспадаркі ў вёсцы Угляны Мінскага раёна. Задача перад байцамі «Юнацтва» стаяла не з лёгкіх. За 26 дзён трэба было забетанаваць пляцоўкі ў 5500 $м^2$, замяшаць 650 $м^3$ бетону і ўкласці 750 метраў бардзюра. Калі прайшло два з палавінай тыдні з пачатку работы — план быў выканан на 50 працэнтаў. Але нярэдкія прастоі з-за адсутнасці неабходнай тэхнікі, дрэнная пастаўка матэрыялаў сур'ёзна паставілі пад пагрозу зрыву ўсе абавязацельствы будатрада. Шмат намаганняў давялося прыкласці камандзіру атрада Пятру Лямешчанку і ўсім байцам, каб усё ж выканаць рабочую праграму, стрымаць сваё слова. За кароткі тэрмін байцы перавыканалі план на 40 працэнтаў.

Добра папрацавалі І. Шанібораў, В. Смальянаў, У. Дашкевіч і іншыя. Увогуле поспех атрада залежаў ад стараннасці і добрасумленнасці кожнага. За гэты нядоўгі, але напоўнены напружанай працай час, усе хлопцы сталі добрымі сябрамі. А гэта — таксама галоўнае.

**В. ЕРМАКОЎ,**
**студэнт факультэта журналістыкі.**

# ІНТЭРВ'Ю Ў ТРЫ ПЫТАННІ

**ПЕРШАКУРСНІК — З'ЯВА НЕЗВЫЧАЙНАЯ, ПРЫВАБЛІВАЯ І ЛЕДЗЬ НЕ САМАЯ ЦІКАВАЯ Ў ЖЫЦЦІ ВНУ. ЧАЛАВЕК, ЯКІ НА КОЖНЫМ КРОКУ РОБІЦЬ ДЛЯ СЯБЕ АДКРЫЦЦІ І ЯКІ ДЛЯ ІНШЫХ — БОЛЬШ СТАРЭЙШЫХ — САМ АДКРЫЦЦЁ.**

**ХТО ПРЫЙШОЎ ВУЧЫЦЦА ВА УНІВЕРСІТЭТ, ЧЫМ ВЫЗНАЧАЕЦЦА ГЭТА АСОБА, ШТО НОВАГА ЯНА ЎНЯСЕ Ў ЖЫЦЦЁ НАШАЙ УСТАНОВЫ — ВОСЬ ШТО ХАЦЕЛІ МЫ ЎСТАНАВІЦЬ, КАЛІ ПРАВОДЗІЛІ АНКЕТУ ПЕРШАКУРСНІКА.**

**СЛОВА — БУДУЧЫМ ЮРЫСТАМ І ЖУРНАЛІСТАМ.**

**1. Якімі былі ўражанні ад першага дня вучобы ў БДУ!**

**2. Свет вашых захапленняў.**

**3. У якую грамадска-палітычную і культурна-масавую галіну накіруеце сваю энергію!**

**ВАЛЕРЫЙ КІРЫЧЭНКА.**

1. Ашаламляльна. Выкладчыкі Е. Васілеўская (гісторыя КПСС), І. Марціновіч (суд і правасуддзе), Э. Калініна (гісторыя дзяржавы і права замежных краін) унеслі жыватворны струмень ведаў у стаячую ваду майго невуцтва. І ўрэшце гэта быў доўгачаканы дзень. Тры разы я паступаў на юрфак безвынікова. Прайшоў выпрабаванне ваеннай службай, працай на вытворчасці (завод пластмасавых вырабаў у Барысаве), займаўся на падрыхтоўчым аддзяленні універсітэта. Нарэшце, чацвёрты мой абітурыенцкі сезон закончыўся шчасліва...

2. Не хопіць паперы запісаць тут усе захапленні. Лічу, што юрысту патрэбна добра ведаць і палітыку, і тэхніку, і мастацтва і літаратуру. Вось калі стану пракурорам рэспублікі, успомніце гэта.

3. Хай дэканат ловіць на слове — буду ўдзельнічаць у спартыўных мерапрыемствах і мастацкай самадзейнасці факультэта.

**АЛЯКСАНДР УСЕНЯ,**

1. Пасля першага дня вучобы жаданне вучыцца паявілася невыказнае. Асабліва спадабаліся выкладчыкі: тлумачаць матэрыял проста і разам з тым вельмі граматна. Рад, што буду працягваць вучобу іменна ва універсітэце.

2. Люблю літаратуру і спорт. Нават не ведаю, чаму аддаць перавагу. Пастараюся спалучаць іх. Сам пішу вершы. Удзельнічаю ў мастацкай самадзейнасці. Быў пераможцай першага рэспубліканскага конкурсу дэкламатараў-школьнікаў.

3. Грамадска - палітычная і культурна-масавая работа заўсёды захапляе мяне. Пастараюся прымаць актыўны ўдзел у рабоце літаратурнага аб'яднання, спартыўных секцый.

**ТАЦЦЯНА БАРОДЗІЧ.**

1. Напярэдадні не спалася, як першакласніцы. Амаль за гадзіну да заняткаў была ў аўдыторыі. Шчаслівыя ўсмешкі, новыя знаёмствы, хваляванні... Лекцыі — уводзіны ў прадметы—вузкія сцяжынкі ў глыбіню ведаў. Дзень незабыўны!

2. Цікаўлюся чалавекам, яго ўнутраным багаццем, светам дум і мар. Вабяць праблема калектыву, узаемаадносін людзей, пошукі адзінства.

3. Сцэна! Мара — студэнцкі тэатр. Калі прымуць — няма вольных хвілін.

**ВЕРАНІКА КОЗЕЛ.**

1. Нават цяпер трошкі хвалююся, успамінаючы той дзень. І ў памяці светла-светла... Вось і аўдыторыя, дзе абітурыентамі мы пісалі сачыненне, вось той выкладчык... Але мы іншыя, мы—студэнты!

2. Больш за ўсё на свеце люблю вершы. Што можа быць цудоўней беларускіх вершаў?! Як было б здорава, каб усе людзі на зямлі размаўлялі белымі вершамі. І яшчэ без чаго я не ўяўляю свайго жыцця, дык гэта без дарогі. Вырастаюць крылы, калі трымаеш у руках руль матацыкла. Адно імгненне — і я ў нейкім іншым свеце. Спыняю матацыкл, бяру ў рукі блакнот, і на паперы застаюцца першыя нясмелыя радкі...

**ІРЫНА ПЯТРОВА.**

1. Ці змагу данесці да 1980 года радасць—радасць першага дня ў БДУ?..

2. У школе тры гады ўзначальвала культурна-масавы сектар камітэта камсамола. Люблю камсамольскую работу.

3. Ёсць вялікае жаданне — вучыцца фатаграфаваць так, каб кожны чалавек адкрыў сябе нанава.

**ПЁТР РАМАНЧУК.**

1. Усё было цікава. І нейкі няўлоўны дух урачыстасці, які пануе ва ўсіх і ва ўсім.

2. Захапленне — пісаць. Пісаць пра ўсё, што бачыш, пра што чуеш, пра што думаеш. Для таго каб пісаць лепш, трэба вучыцца ў іншых, чытаць творы майстроў. І шчасце, калі хоць на крупінку атрымаеш больш, чым маеш...

3. Хачу вучыцца.

**МАРЫЯ МІТРАХОВІЧ.**

1. Першы раз на першы курс — вядома, хвалявалася. А тут амаль кожны выкладчык прыстрашыў недалёкай сесіяй, паабяцаў, што яна будзе цяжкай. Зараз мне здаецца, што заўтра экзамен, а я нічога не ведаю.

2. Хочацца ведаць як мага больш, хапаешся за ўсё, а ў выніку — павярхоўнасць і сумбур. Спорт, музыка, жывапіс, паэзія — як усё гэта «раскласці па паліцах»?

3. Стаю на ростанях. Што рабіць, каб усюды паспяваць — у вучобе не адстаць, грамадска-палітычную работу не аставіць? Стаю на ростанях...

**ТАЦЦЯНА МАНЁНАК.**

1. Колькі было бяссонных начэй, колькі было хваляванняў, а цяпер гэта — успаміны. Першы дзень. Вядома, вы ўсе помніце, што гэта быў сонечны, на дзіва цёплы восеньскі дзень. Сонечныя зайчыкі заглядвалі кожнаму ў вочы — і ўсе ўсміхаліся. Ціха ў вестыбюлі. Падыходзяць да люстэркаў дзяўчаты, усміхнуцца — і знікнуць у аўдыторыі. 8.30. Лекцыя пачалася, адкрыты зусім новенькія сшыткі, на тварах — незвычайная ўзрушанасць.

Можа мой расказ не атрымаўся, прабачце. Я яшчэ ніяк не магу прыйсці ў сябе ад убачанага. А наперадзе — пяць студэнцкіх гадоў. Так многа і так мала...

3. Ва універсітэце столькі цікавага, незвычайнага, што сумаваць часу не хопіць. Хочацца шмат зрабіць, не траціць ні хвіліны дарэмна. Я, шчыра кажучы, не магла нават уявіць усяго, што прывабіла з першых дзён.

**АРКАДЗЬ ЖУРАЎЛЁЎ,**

1. Вельмі спадабаліся лекцыі па спецыяльнасці — тэорыі і практыцы савецкай журналістыкі, фотасправе. Дзень, калі я сеў за студэнцкі стол, — самы шчаслівы.

2. Па-першае, цікавіць чыста журналісцкая праблема — характар чалавека - працаўніка, яго месца ў грамадстве. Па-другое, я вельмі люблю прыроду, мо таму, што нарадзіўся і вырас непадалёку ад возера Свір. Там прайшло маё дзяцінства і юнацтва.

3. Як староста групы буду прыкладаць усе намаганні для таго, каб наша група была ў ліку лепшых.

**Анкету правялі М. КУРГАНСКІ і С. ШЫДЛОЎСКАЯ.**

# СЁННЯ БРАЦКІ БАЛГАРСКІ НАРОД АДЗНАЧАЕ СВАЁ НАЦЫЯНАЛЬНАЕ СВЯТА—ДЗЕНЬ СВАБОДЫ.



*Помнік воінам Савецкай Арміі ў Сафіі.*

## ТОЛЬКІ ФАКТЫ

**Дзімітраўскі камуністычны саюз моладзі створан у 1947 г. у выніку аб'яднання раду маладзёжных арганізацый. Членамі ЛКСМ з'яўляюцца больш 1,3 млн. юнакоў і дзяўчат НРБ.**

* * *

**У першыя гады народнай улады ў краіне былі створаны ўмовы для таго, каб дзеці рабочых і сялян маглі вучыцца. Да 1954 г. была ліквідавана непісьменнасць сярод працаздольнага насельніцтва. По ліку студэнтаў прапарцыянальна насельніцтву Балгарыя знаходзіцца на адным з першых месц у свеце.**

* * *

**Першая група балгарскіх студэнтаў прыбыла ў Савецкі Саюз у 1946 г. Гэта былі юнакі і дзяўчаты, якія з адзнакай закончылі сярэднюю школу, былыя партызаны, камсамольскія работнікі.**

* * *

**На сённяшні дзень у Балгарыі налічваецца каля 5000 спецыялістаў, атрымаўшых дыпломы ў вышэйшых навучальных установах СССР. Зараз у нашай краіне навучаецца каля 1800 балгарскіх студэнтаў.**

**Старонка падрыхтавана аддзяленнем таварыства савецка-балгарскай дружбы БДУ**

*Нафтахімічны камбінат ля горада Бургаса.*



# МАГІСТРАЛЛЮ САЦЫЯЛІЗМУ



**9** ВЕРАСНЯ 1944 года — дзень устанаўлення народнай улады— залатымі літарамі ўпісаны ў трынаццацівяковую гісторыю Балгарыі. У гэты дзень працоўныя краіны пры падтрымцы Савецкай Арміі зверглі манарха-фашысцкі рэжым, беззваротна пакончылі з капіталістычнай эксплуатацыяй, сталі паўнаўладнымі гаспадарамі свайго лёсу. Балгарыя ўступіла на шлях сацыялістычнага развіцця.

За 32 гады — параўнаўча кароткі адрэзак часу для гісторыі любой краіны — працоўныя Балгарыі пад кіраўніцтвам БКП дабіліся выдатных поспехаў на шляху сацыяльнага і духоўнага прагрэсу. Сацыялізм, нарадзіўшы небывалы энтузіязм народа, да непазнавальнасці змяніў аблічча Балгарыі, падняў узровень жыцця і культуры народа.

У параўнанні з 1939 годам Народная Рэспубліка Балгарыя вырабляе больш чым у 50 разоў прамысловых тавараў. Значна змянілася структура балгарскай эканомікі. За гады сацыялістычнага будаўніцтва суадносіны прамысловай і сельскагаспадарчай прадукцыі змяніліся з 77,1:22,9 на 81,2:18,8, пры гэтым доля прамысловасці ў вытворчым нацыянальным прыбытку ў 1975 годзе дасягнула амаль 55 працэнтаў. Сёння машынабудаўніцтва дае ўжо больш чвэрці валавой прадукцыі і каля 40 працэнтаў усяго экспарту Балгарыі. Краіна выпускае сучасныя станкі, ЭВМ, мотакары і электратэльферы, трактары, комплекснае прамысловае абсталяванне для шэрагу прадпрыемстваў і г. д.

У 1976 годзе ў жыцці працоўных Балгарыі адбыліся падзеі вялікай дзяржаўнай важнасці. XI з'езд Балгарскай камуністычнай партыі, які адбыўся ў сакавіку—красавіку, распрацаваў канкрэтную праграму далейшага будаўніцтва развітога сацыялістычнага грамадства. Пачаўшаяся сёмая балгарская пяцігодка заклікана стаць перыядам дынамічнага росту народнай гаспадаркі. У 1976—1980 гадах прамысловая вытворчасць узрасце на 55—60 працэнтаў. Нацыянальны даход дасягне 93 мільярдаў леваў. Капіталаўкладанні ў народную гаспадарку складуць 30 мільярдаў леваў, што ў паўтара раза больш, чым у папярэдняй пяцігодцы. Гэтыя лічбы гавораць самі за сябе. Яны дэманструюць перад усім светам жыватворную сілу сацыялізму, яго бясспрэчную перавагу перад капіталістычнай сістэмай.

Турэцкая газета «Ени улус» не так даўно надрукавала артыкул, у якім адзначалася: «Наша суседка Балгарыя, якая выклікае захапленне ў нас сваімі дасягненнямі, сёння паспяхова змагаецца за месца сярод развітых прамысловых дзяржаў свету».

У сваёй працы балгарскі народ абапіраецца на супрацоўніцтва з СССР, якое пастаянна расшыраецца. Балгарыя прымае актыўны ўдзел у ажыццяўленні шматбаковых мерапрыемстваў, якія прадугледжаны Комплекснай праграмай сацыялістычнай эканамічнай інтэграцыі краін — членаў СЭУ. У прыватнасці, яна ўдзельнічае ў будаўніцтве газаправода, па якому арэнбургскі газ ад берагоў Урала будзе дастаўляцца ў 6 дзяржаў — членаў СЭЎ, у тым ліку і Балгарыю.

Няўхільна расце дабрабыт працоўных. Толькі за апошнія 5 гадоў рэальныя даходы працоўных узраслі на 32,4 працэнта, а грамадскія фонды спажывання павялічыліся на 47,8 працэнта.

Сёння кожны пяты грамадзянін рэспублікі вучыцца. Колькасць студэнтаў у ВНУ перавысіла 105 тысяч юнакоў і дзяўчат. Інакш кажучы, у Балгарыі на 10.000 жыхароў прыходзіцца 121 студэнт. Для параўнання можна ўказаць, што ў Турцыі — 47, ФРГ — 97, Вялікабрытаніі — 108 студэнтаў.

Сацыялістычны лад у Балгарыі адкрыў шырокую прастору для ўсебаковага развіцця духоўнага жыцця грамадства, для росквіту навукі, літаратуры, мастацтва, для раскрыцця народных талентаў і дараванняў.

У краіне з насельніцтвам каля 9 мільёнаў чалавек — 60 тэатраў, у тым ліку 5 оперных, амаль 200 дзяржаўных музеяў, 11 тысяч бібліятэк. Штогод выдаецца 50 мільёнаў экземпляраў кніг. Такія лічбы гавораць самі за сябе.

Дружба і супрацоўніцтва Народнай Рэспублікі Балгарыі і Савецкага Саюза з'яўляюцца ўзорам сацыялістычнага інтэрнацыяналізму ў дзеянні. Ацэньваючы вялікае значэнне балгара-савецкай дружбы, Першы сакратар ЦК БКП таварыш Тодар Жыўкаў на XI з'ездзе партыі сказаў, што мы ўжо ўпэўнена можам гаварыць аб якасна новай патрыятычнай і інтэрнацыяналісцкай свядомасці балгарскага народа, аб узнікненні і сцвярджэнні патрыятызму новага тыпу, калі любоў да Балгарыі і Савецкага Саюза ўзаемна дапаўняе і ўзбагачае адзін аднаго і ўсё больш зліваецца ў адзінае пачуццё, у адзіную свядомасць.

Народная Рэспубліка Балгарыя, неад'емная частка сусветнай сацыялістычнай садружнасці, уносіць свой уклад у справу ўзмацнення згуртаванасці і ўзаемадзеяння брацкіх сацыялістычных краін, за ўсталяванне бяспекі народаў.

**Д. Б. МЕЛЬЦАР,**
**в. а. прафесара БДУ імя У. І. Леніна.**

**Анастас СТАЯНАЎ**

## ВАДА

Пасля Юр'я, штовечар,
помню—
толькі месяца блісне
рог, —
жбан вады крынічнае
поўны
мама ставіла за парог.

І казала мне: колісь,
сыне,
за турэцкім яшчэ ярмом,
рушыў атрад па даліне
да Урачанскіх суровых
стром.

Дзвесце душ, акрылёных
адвагай,
ваявода-герой на чале.
Даняла іх аднойчы
смага —
парашылі папіць у сяле.

А ў сяле — бы вымерлі
ўсе там:
напаіць іх ніхто не змог...
З той пары ў нашым краі
летам
ставяць жбан вады за
парог.
Бо як толькі ўцямрэе
неба—
ад сяла да сяла ідуць
на чале з ваяводам
гнеўным
дзвесце змучаных
смагай душ.
Атрад сасмяглы, я цябе
помню—
стрэльба да стрэльбы,
крок у крок!
І вучу дзяцей сваіх
жбан поўны
ставіць вечарам
за парог.



*Збор вінаграду.*

## ЦІ ВЕДАЕЦЕ ВЫ, ШТО...

...у вёсцы Баня Благоеўградскай акругі ўстаноўлены адзіны ў Балгарыі агульны помнік У. І. Леніну і Г. Дзімітрову. Бронзавая скульптура ўвекавечыла сустрэчу Леніна з Дзімітровым на III кангрэсе Камінтэрна ў 1921 г.

...першым кур'ерам ленінскай «Искры» быў Іван Загубанскі. Ён дастаўляў каштоўны груз з Варны ў Адэсу.

...першая балгарская газета «Былгарски орел» выйшла 130 год назад у Лейпцыгу. Яе заснавальнікам быў студэнт Іван Багораў.

...у Балгарыі каля 450 помнікаў рускім і савецкім воінам, аддаўшым жыццё за свабоду і незалежнасць балгарскага народа.

...у бітвах за вызваленне Балгарыі ад асманскага іга прымаў удзел сын Аляксандра Сяргеевіча Пушкіна. У 1877—1878 гг. Аляксандр Аляксандравіч камандаваў кавалерыйскім палком і быў узнагароджан залатой шабляй з надпісам «За храбрасць».

...5 верасня 1974 г. адбыўся ўрачысты пуск першай у НРБ атамнай электрастанцыі «Казлaдуй», пабудаванай пры ўдзеле савецкіх спецыялістаў.

...у краіне каля 400 памятных гістарычных месц, 77 запаведнікаў, 500 мінеральных крыніц, 2000 даследаваных і недаследаваных пячор.

...на XXI летніх Алімпійскіх гульнях у Манрэалі балгарскія спартсмены заваявалі 7 залатых, 8 сярэбраных і 9 бронзавых медалёў.

...самае высокае дрэва ў Еўропе — 56-метровая елка — расце каля сяла Трыград у Радопах.

## ФОТААКНО ПАДАРОЖНІКА



**Каўнас — горад ля мора. Ён патанае ў зяленіне паркаў і сквераў, перахоплены кальцом узгоркаў і лясоў. Гэта горад са шматвяковай гісторыяй, сучаснай прамысловасцю.**

**Ля сутокі рэк Нямунаса і Нерыс стаіць Каўнаскі замак — гісторыка-архітэктурны помнік XIV стагоддзя. Рысы гатычнай архітэктуры носіць не адзін будынак у Каўнасе.**

Фота **Т. і А. Сахашчыкаў.**



## СТУДЭНЦКАЯ РЭЦЭНЗІЯ

# КРУГАЗВАРОТ БЕЗ НАЗВЫ

З першых зборнікаў вершаў Уладзіміра Дзюбы прыхільнікі паэзіі пазнаёміліся чатыры гады назад. У кніжачцы «Вуліцы без назваў» было сабрана усё лепшае, напісанае аўтарам. Як бачна, крок у «вялікую» літаратуру паэт зрабіў даволі асцярожна, пакуль што не даў назвы вуліцам у пабудаваным ім жа уласным паэтычным горадзе.

**Крытыка заўсёды добразычліва ставіцца да паяўлення на літаратурным небакраі яшчэ адной невядомай, хоць на пачатку ледзь прыкметнай, зорачкі. Але задача крытыкі заключаецца не ў тым, каб зарэгістраваць новую кнігу і забыць пра яе. Наадварот, знайсці ў кволым парастку скрытыя хваробы, выявіць іх, каб дапамагчы аўтару пазбегнуць памылак.**

Адкрывае зборнік вянок санетаў пад назвай «Выток». Санеты расказваюць аб здабытчыках беларускай нафты. Аўтар спрабуе, хоць і не вельмі ўдала, аналізаваць падзеі, вызначыць тое, што складае аснову нашых дзён. Дзюбе ў большай меры ўдаюцца радкі аб сучаснасці і сучасніках, паэтызацыя падзей, непасрэдна прайшоўшых праз прызму яго сэрца. Добры след пакідаюць вершы «Пушча», «Асцярожна— лес», «Самалёт». А вось сказаць па-свойму аб мінулым ліхалецці аўтару не ўдаецца. Нічога дзіўнага тут няма. Уладзімір нарадзіўся пасля вайны, і таму ў вершы «Першы дзень вайны» назіраецца проста пераказ прачытанага, расказанага старэйшымі, але не перажытага, што дае права на жыццёвасць таго, аб чым ідзе размова.

**Калі першы крок зроблен, першая прыступка заваявана, надыходзіць пара ўзняцца і на другую, узяўшы на ўзбраенне усё лепшае, што было дасягнута раней. Пасля выхаду ў свет першага твора ў аўтара ёсць магчымасць, перш чым працаваць над новай работай, падумаць, прааналізаваць удачы і недахопы, зірнуць, так сказаць, збоку на свае здабыткі і толькі тады садзіцца за пісьмовы стол.**

Сёлета выдавецтва «Мастацкая літаратура» прапанавала чытачам другі зборнік Ул. Дзюбы — «Кругазварот». Кожны аўтар ідзе на пэўную рызыку, вырашыўшы выдаць наступную кнігу. Асабліва гэта датычыцца другой па ліку. Гэта ўжо заяўка на сталасць, на сваё месца пад «літаратурным сонцам». Крытыка тут не робіць скідак на вучнёўства. Размова аб новай рабоце аўтара ідзе адкрыта і шчыра, а часам нават рэзка. Тут нельга не прыпомніць словы В. Р. Бялінскага наконт таго, што «рэзкі тон у многіх выпадках адзіны тон, дапушчальны для крытыкі».

**Што новага сказаў Уладзімір Дзюба ў «Кругазвароце»? Ці не «паўтарэнне пройдзенага» ў новым зборніку? У анатацыі вызначаецца, што «аўтар вядзе шчырую размову са сваімі сучаснікамі, паказвае іх людзьмі мужнымі, улюбёнымі ў жыццё і свой родны край».**

З дваццаці пяці вершаў, якія склалі кнігу, мне хацелася б пагаварыць аб трох, на мой погляд найбольш удалых, а іменна: «Мы ў кааперацыю ішлі», «Мацней, крыло» і «Жніво». Іх розніць не толькі тэматыка. У першым паэт працягвае размову аб бясхлебных пасляваенных гадах. Дзюба паказвае сцэнку з былога, пакінуўшага след у сэрцы. Чытач нібы ўвачавідкі бачыць сельскую краму таго часу, дзе «цукерак розных дужа, пячэнне там у скрынях дзвюх...» Разам з маленькім героем радуемся таму, што вайна пакрысе адступае, а жыццё наладжваецца.

«Мацней, крыло!» —лірычная замалёўка. Шчыра і пасвойму праніклёна апавядае аўтар пра засяленне шпакоў у шпакоўні, пра іх прагу мірнага жыцця.

**Прызнаюся шчыра, у трэцім вершы я шукаў слова «каса». Так, так, думаў знайсці звычайную сялянскую касу, якая, на жаль, да гэтага часу незразумела чаму ніяк не жадае заняць сваё пачэснае месца ў музеі, а наадварот, упэўнена вандруе з кнігі ў кнігу. Многія паэты— і не толькі маладзейшага пакалення — да сённяшняга дня ўпарта косяць травастой дзедаўскім метадам і нават больш — услаўляюць яго! Яны нібыта забыліся, што на двары пярэдадзень новага тысячагоддзя, што усюды пануе тэхніка.**

Прыемна усведамляць, што Ул. Дзюба трымае руку на пульсе часу. Верш «Жніво»—гімн хлебу, хлебаробам наогул. Не каса, а камбайн —паўнапраўны гаспадар поля.

...Калі звініць даспелы колас,
Калі чуваць мне бацькаў
голас:

— Па трыццаць возьмем...
Жыта — во!..

Мы адзначылі вершы больш запамінальныя, удалыя. Аднак у зборніку не адзін і не два радкі, лік ідзе на сотні. Сказаць пра таленавітыя творы і змаўчаць пра недахопы — значыць падысці да разгляду творчасці Ул. Дзюбы адчабакова. У кожнага паэта ёсць паласа няўдач. Вось у такую паласу, на жаль, трапіў і малады паэт. Другі зборнік — сведка таму. Мне здаецца, што Уладзімір Дзюба пачаў таптацца на месцы, як чалавек, які дасягнуў пастаўленай мэты. «Кругазварот» не мае той навізны, якая была, напрыклад, у паэтычных кнігах Л. Дайнекі, М. Маляўкі, Я. Янішчыц. Закрываем апошнюю старонку, а на сэрцы незадаволенасць: нібы чытаў усё гэта раней, большасць вобразаў і параўнанняў трафарэтныя, незапамінальныя. А гэта не можа абудзіць думку, збядняе паэтычны свет чытача.

**В. ЗАДАЛЯ,**
**студэнт V курса журфака.**

# ... І ТАДЫ ЗДАРАЕЦЦА

Як было адзначана, за перыяд першага паўгоддзя 1976 года значная колькасць дарожных аварый здараецца па віне пешаходаў, якія замест строгага прытрымлівання правіл дарожнага руху часта парушаюць іх: пераходзяць вуліцу перад блізка ідучым транспартам. Так, напрыклад, вадзіцель аўтамабіля «Запарожац» Спічкін на вуліцы К. Цэткін зрабіў наезд на вартаўніка інстытута мікрабіялогіі Барадзіну, якая пераходзіла вуліцу перад блізка ідучым транспартам.

Парушаючы правілы дарожнага руху, пешаходы перасякаюць праезджую частку ў неўстаноўленым месцы і на забараняючы сігнал светафора. Вялікую небяспеку для дарожнага руху прадстаўляюць пешаходы, якія знаходзяцца ў стане ап'янення. Яны ставяць пад пагрозу не толькі сваё жыццё, але і жыццё акружаючых. Так, на вуліцы Ташкенцкай грузавым аўтамабілем пад упраўленнем вадзіцеля Сілко быў збіт слесар ЦЭЦ-3 Занямонец, які, будучы ў нецвярозым стане, пераходзіў вуліцу перад блізка ідучым транспартам. Пешаход атрымаў цяжкую траўму.

З ростам аўтапарка павышаецца інтэнсіўнасць руху на вуліцах і дарогах. У такіх умовах нават самыя нязначныя адхіленні ў паводзінах пешаходаў і вадзіцеляў ад устаноўленых «Правілаў дарожнага руху» прыводзяць да дарожна-транспартных здарэнняў.

**Г. СТРАЛЬЧОНАК,**
**інструктар ДАІ.**

# РОССЫПЫ ВЫДУМАК І ТАЛЕНТАЎ ЧАЛАВЕЧЫХ

У 1961 годзе ў Італіі 22-гадовы студэнт Джуліо **ДЖУДЗІ** прадэманстраваў фенаменальную памяць. Праслухаўшы 36 тыс. слоў, зусім не сістэматызаваных, ён пасля шасцігадзіннага чытання змог паўтарыць усе словы па парадку і ў разбіўку або прапускаючы кожнае трэцяе слова.

***

Англічанін **В. ПАРАТ** — славуты арганіст-віртуоз — валодаў незвычайнай памяццю. У 1862 годзе, калі яму быў усяго 21 год, ён даў канцэрт, у якім па памяці выконваў Баха, Бетховена, Моцарта і Шапэна. Адначасова ён усляпую іграў дзве шахматныя партыі з моцным праціўнікам, які сядзеў за яго спіной. Ён бліскуча справіўся з задачамі: музыкай прывёў у захапленне слухачоў і выйграў абедзве шахматныя партыі.

***

Нью-йоркскі мастак **БАНВАРД** напісаў самую вялікую карціну. Яе даўжыня — 4,8 км! Работа над гэтай карцінай пачалася ў 1840 годзе. Банвард 400 дзён плыў на лодцы па Місісіпі, робячы накіды і вымяраючы адлегласць. Потым 6 гадоў пайшло на стварэнне палатна, на якім намалявана «Панарама Місісіпі» — 2 тыс. км берагоў вялікай ракі ад вусця да Новага Арлеана. Панараму часта дэманстравалі і ў ЗША, і ў Еўропе, потым яна была куплена нейкім англічанінам, які адвёз яе ў Індыю, дзе яна і згубілася.

# АДКРЫЦЦЁ ТЭАТРАЛЬНАГА СЕЗОНУ

**Верасень адкрыў новую старонку ў жыцці студэнцкага тэатра універсітэта. Да заслужанага артыста Латвійскай ССР Аляксандра Міхайлавіча Озерава прыйшлі студэнты малодшых курсаў — аматары тэатральнага мастацтва. Першым сцэнічным выпрабаваннем стане для іх удзел у аднаўленых спектаклях СТ—п'есе К. Чапека «Маці» і трагедыі В. Шэкспіра «Рамэо і Джульета».**

**Асноўны састаў тэатра прыступіў да пастаноўкі новай п'есы — «Валянцін і Валянціна» М. Рошчына. Спектакль цікава задуман. Мяркуецца ўвесці такі элемент, як імправізацыя артыстаў і прыцягненне да сцэнічнага дзеяння гледачоў. Рэжысёр спектакля — выпускнік тэатральнай студыі універсітэта, мастацкі кіраўнік самадзейнасці БДУ Анатоль Касцецкі. Пастаноўкай кіруе А. М. Озераў.**

**С. УСЦІНОВІЧ.**

УВАГА! УВАГА! УВАГА!

**У СУВЯЗІ З УЗРАСТАЮЧАЙ СМЕХАНІЗАЦЫЯЙ, ЖАРТАМАНІЯЙ І ГУМАРАШАНАВАЛЬНАСЦЮ СЯРОД САМЫХ ШЫРОКІХ СЛАЁЎ СТУДЭНЦТВА І ВЫКЛАДЧЫКАЎ ПРЫ РЭДАКЦЫІ «БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ» СТВОРАНА**

# КАФЕДРА АГУЛЬНАГА СМЕХАРОБСТВА

Базай для «кафедры» з'явіўся існуючы вось ужо некалькі год на старонках нашай газеты «Гумарыстычны перапынак». Кіраванне работай «кафедры» даручана маладому перспектыўнаму дацэнту Незалікіну, які зусім на днях звышпаспяхова абараніў доктарскую дысертацыю на даволі складаную тэму: «Амар Хаям у Чашніках, або як смяяцца, каб потым не плакаць». Каб пераканацца ў тым, што дысертацыя Незалікіна з'яўляецца унікальным навуковым даследаваннем у галіне смехараспаўсюджвання, дастаткова, напрыклад, прачытаць некалькі трапных выразаў з дысертацыі (публікуецца на мове арыгінала): «полутехнический институт», «учёный уж», «затройщик», «сдувать экзамены», «бес воображений», «фирменное безобразие», «пророк сердца».

У біяграфіі загадчыка «кафедры» ёсць цікавы момант, які зрабіў Незалікіна шырока вядомым. Гэта адзіны выпадак з яго выкладчыцкай практыкі, калі ён сказаў аднойчы на экзамене: «Вазьму грэх на душу, пастаўлю, бацэнька, вам тройку». Сказаў — і зрабіў.

Прадстаўляючы новага загадчыка «кафедры», трэба яшчэ дадаць, што ён — нястомны прыхільнік сваёй справы — справы самага найкарыснейшага гумару.



(На малюнку—дацэнт Незалікін).

Зараз на кафедры ўжо пачалі працаваць выкладчык Канспектаў і лабарант Пісулькін. (На малюнках адпаведна першы і другі).







На першым пасяджэнні «кафедры» пры размеркаванні грамадскіх даручэнняў Канспектаў быў прызначаны адказным за работу СНТ, а Пісулькін — за выпуск насценгазеты. Абодва горача ўзяліся за сваю справу.

Цікава, што амаль адразу ж знайшліся жадаючыя пісаць на «кафедры» навуковыя работы. Сярод іх—першакурснік Шура Шпора. Што датычыцца апошняга, то ён здзіўляе усіх выдатнымі здольнасцямі рабіць самыя незвычайныя ляпсусы ў сваіх сачыненнях.

Акрамя таго, на першых жа лекцыях высветлілася, што Шура—фанатычны шаржыст-самавучка, які ў адзін момант бярэ на аловак твар любога выразу. Згадзіцеся, што гэтыя малюнкі, зробленыя ім для візітнай карткі «кафедры», як і яго аўташарж, не пазбаўлены якой-ніякой тыповасці. А калі на ўступных экзаменах стала вядома, што Шпора— адзін з нешматлікіх пляменнікаў вядомага людаведа і душалюба, то на факультэце некаторыя занепакоіліся, маўляў, хто яго ведае, глядзіш—яшчэ адным **дэканаедам** будзе больш. Але шуткаваць не сталі, прынялі.

Зараз на «кафедры» акрэслены асноўныя напрамкі навуковых даследаванняў, распрацаваны сур'ёзныя планы работы. Але па-сапраўднаму разгарнуць гэту справу амаль немагчыма: не хапае кадраў. Дацэнт Незалікін папрасіў нас даць аб'яву аб замяшчэнні вакантных пасад на «кафедры». Прымаюцца ўсе жадаючыя



без даведак і характарыстык, але з запасам гумару любых памераў.

Нам застаецца пажадаць: у добры шлях, «кафедра», пошукаў і адкрыццяў табе на нялёгкім шляху гумару і сатыры.

**В. а. рэдактара**
**В. А. ВОЛЬСКІ.**

«Белорусский университет» — орган парткома, ректората, месткома, комитета комсомола и профкома Белорусского ордена Трудового Красного Знамени государственного университета им. В. И. Ленина. На белорусском языке.

Газета выходзіць па чацвяргах. Тыраж 2.000 экз.
Аб'ём — 1,5 друк. ар. АТ 04420 **Заказ. № 1306.**

**Наш адрас: Мінск, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19. Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.**